*І. М.ГРАМОВІЧ*

# ДЫЯЛЕКТ ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ РЭГІЯНАЛЬНАЙ МАНЕРЫ СПЕВАЎ

“... розныя галосныя гукі, прапетыя на адным узроўні, па-рознаму ўздзейнічаюць на ступень змыкання галасавых складак, інакш кажучы, са-дзейнічаюць фарміраванню розных адценняў у рэгістравым гучанні голасу” [1, с.22]. Такое сцвярджэнне Г.П.Стулавай падкрэслівае значнасць мовы ў вакальным мастацтве і неабходнасць вывучэння асаблівасцей яе ўжывання ў спевах.

Спевы і мова ўзаемадзейнічаюць, таму што з’яўляюцца прадуктам дзейнасці галасавога апарату. У жыцці людзі размаўляюць па-рознаму: у адных мова дакладная, гучная і зразумелая, у іншых – глухая, млявая і невыразная. У спевах адбываецца тое ж самае. Дрэннае вымаўленне адбіваецца на якасці гучання голасу. Назіранні за выканаўцамі народнай песні паказалі, што прыгажосць мовы і яе рэгіянальныя асаблівасці ўплываюць на фарміраванне гукаў пры спевах. Наша гутарковая мова насычана рознымі сэнсавымі інтанацыямі, і “гутарковасць народнай манеры спеваў” патрабуе захавання і перадачы гэтых інтанацый. Такія выканальніцкія прыёмы ў народных спевах, як слізганні, уздыхі, падзенні голасу, прыгукі (народныя фаршлагі), расцягванні слоў на дадатковыя галосныя, агласоўка зычных, разрывы слоў і паўторы складоў ідуць менавіта ад моўных інтанацый.

Дыялектная разнастайнасць беларускага песеннага фальклору з’яўляецца прадметам дыскусій. Выканаўцам важна ведаць рэгіянальныя спеўныя стылі, таму што гэта веданне дапамагае вырашыць, ці прадстаўляць якую-небудзь спеўную традыцыю з выкарыстаннем мясцовай гаворкі, ці выконваць народную песню на літаратурнай мове. Вядома, што найбольш каларытнымі і непаўторнымы будуць спевы на мове арыгінала.

Пры навучанні народным спевам вельмі важна вызначыць межы засваення дыялектаў, гэта значыць ці дакладна іх падаць, ці захаваць толькі асноўныя рысы. Можна поўнасцю пагадзіцца з Л.В.Шамінай, якая лічыць дакладнае авалодванне дыялектам “утопіяй”, таму што цяжка знайсці “спевака-паліглота” [2, с. 25]. Сэнс захавання дыялектаў як своеасаблівай афарбоўкі ў сучасным выкананні заключаецца ў тым, каб зберагчы генетычную прыроду народных спеваў. Дыялектная фанетыка, рэгіянальная гаворка ствараюць тую непаўторную афарбоўку гуку і тэмбру, якая тычыцца гукаідэалу кожнай этнічнай культуры, нацыянальных асаблівасцей музыкальнага інтанавання.

Мова кожнага народа вызначаецца асаблівай сістэмай музычна-моўных кампанентаў, меладычнасцю, што з’яўляецца асновай ў народнапесеннай традыцыі. Што тычыцца народнай манеры спеваў, то гэта цэлы комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў, прыёмаў, якія склаліся на аснове мясцовых гісторыка-культурных і мастацкіх традыцый пад уплывам бытавога спеўнага асяроддзя. Народная манера ярка выяўляецца ў мясцовых асаблівасцях маўлення. Калі лёгка можна сабе ўявіць асаблівасці мовы Піншчыны і Гомельскага Палесся, Паазер’я, Міншчыны і Гродзеншчыны, то не менш ясна выступае і своеасаблівая, характэрная кожнаму рэгіёну манера спеваў. У народнай манеры спеваў выяўляюцца асаблівасці вымаўлення слоў, выканальніцкі стыль і спеўная сталасць народных спевакоў пэўнай мясцовасці. Кожнаму рэгіёну адпавядаюць свая гаворка і свая манера спеваў. Менавіта таму вывучэнне і захаванне вобразнага каларыту народнай мовы ў спевах з’яўляюцца галоўнай умовай праўдзівасці і дакладнасці выканання. Не толькі ў старажытных, але і ў сучасных песнях, апрацоўках народных песень неабходна перанімаць асноўныя асаблівасці гаворак, дыялекту.

Прааналізуем асаблівасці моўнага аспекту розных рэгіёнаў Беларусі.

У наш час рэгіянальныя гаворкі не такія, як ў мінулым. Вядома, што кожны дыялект мае сваю афарбоўку і адрозніваецца ад літаратурнай мовы. Адзін з даследчыкаў беларускай дыялекталогіі А.А.Крывіцкі ў кнізе “Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі” [3] вылучае на тэрыторыі Беларусі два дыялекты: паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні. Самымі кантраснымі дыялектнымі рэгіёнамі з’яўляюцца рэгіёны Гомельшчыны і Брэсцкага Палесся, Паазер’я і Цэнтральнага рэгіёна.

Вядома, што асноўную і галоўную нагрузку ў спевах нясуць галосныя гукі, таму мы засяродзім сваю ўвагу на ўжыванні менавіта галосных у розных дыялектах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самы распаўсюджаны галосны [а]. Ён уласцівы ўсім гаворкам. Галосны ў спевах ўтвараецца пры найбольш адкрытым роце ў параўнанні з іншымі галоснымі. Гэты гук самы шырокі і гучны. Пры фарміраванні [а] язык адсунуты назад, падзяляе ротавую поласць на дзве паловы і свабодна ляжыць на дне рота. Свабодная і адкрытая манера спеваў характэрна менавіта для акаючых гаворак Мінскай, Віцебскай і некаторых раёнаў Магілёўскай вобласці.

Галосны [о] больш характэрны для паўночна-ўсходніх раёнаў (Брэстчына і Гомельшчына). У спевах галосны гук [о] вельмі блізкі па артыкуляцыі да акругленага спеўнага [а]. Язык на гэтым галосным таксама адсунуты назад. У дыялектах артыкуляцыйная характарыстыка [о] розная. Ён можа змяняцца ад сярэдняга [о] да зусім выразнага [у]. Окаючая традыцыя захавала прынцып “акругласці” ў спевах, таму шматлікае ўжыванне [о] ў окаючых гаворках дазваляе гаварыць аб прыкрытай манеры спеваў.

Па гукавым укладзе вельмі блізка да [о] галосны [у]. Пры ўтварэнні да- дзенага гуку ў спевах рот ледзь-ледзь адкрыты, вусны скручаны ў трубку, язык адсунуты назад. Такое палажэнне галоснага надае яго гучанню “матавы і цёмны” колер. Манера спеваў укаючых гаворак носіць паўпрыкрыты характар пры далёкім гукаўтварэнні.

Якаючыя гаворкі распаўсюджаны ў Віцебскай вобласці, паўночных раё-нах Мінскай, Магілёўскай абласцях і паўночна-ўсходніх раёнах Гомельскай вобласці. Якаючыя гаворкі, як і акаючыя, надаюць спеўнай манеры больш адкрытае і светлае гучанне. Але пры гэтым у адных раёнах ці мясцовасцях захоўваецца мяккасць гукаўтварэння, а ў другіх яно больш цвёрдае. Такое адрозненне звязана з якаснымі характарыстыкамі галосных гукаў [а] і [йа]: першы не такі блізкі па пазіцыі і адпаведна па афарбоўцы гуку, як другі. Менавіта адсюль якаючыя гаворкі надаюць спеўнай манеры мяккае, больш блізкае гучанне.

Галосны [і] сустракаецца ва ўсіх гаворках. У мове і ў спевах харак-тарызуецца блізкай артыкуляцыяй і высокай песеннай пазіцыяй. Пярэдняя частка языка скручана ў трубку і ўпіраецца ў ніжнія зубы, а яго корань апушчаны. Паміж заднім зводам цвёрдага паднябення і коранем языка ўтвараецца невялікая поласць, у якой і фарміруецца галосны [і]. Галосны [і] па гучанні самы заціснуты гук, але, дзякуючы свайму стану, пры ўтварэнні ён надае спевам блізкае гучанне і дапамагае адчуць высокую пазіцыю гуку.

Зусім супрацьлеглы разгледжанаму гуку па сваіх характарыстыках гук [ы]. Ён фарміруецца таксама, як і галосны [і], паміж коранем языка і задняй сценкай цвёрдага паднябення. Яго далёкае становішча надае спевам глыбокае і напружанае гучанне. Уяўленне напружанага гучання адчуваецца ў манеры спеваў некаторых раёнаў Гомельшчыны, дзе распаўсюджаны ыкаючыя гаворкі.

Яшчэ вымаўленне аднаго галоснага заслугоўвае ўвагі – гэта [йэ]. Пры фарміраванні названага галоснага рот адкрываецца шырока, язык адыходзіць назад, ротавая поласць пашыраецца. Екаючыя гаворкі – асаблівасць Гомель-скага рэгіёна і паўднёвых раёнаў Мінскай вобласці. Блізкі ўклад галоснага [йэ] надае манеры спеваў мяккае, светлае гучанне. Па адчуванні ён менш вузкі, чым [і], але больш вузкі, чым [а], [о] ці [у]. Язык рухаецца больш свабодна і дазваляе дастаткова шырока адкрыць рот. Супрацьлеглай галоснай можна лічыць [э]. Далёкае фарміраванне названага галоснага надае манеры спеваў экаючых гаворак напружанае, глыбокае і неяскравае гучанне.

Спецыфіка вымаўлення зычных гукаў таксама не застаецца без увагі выканаўцаў народнай песні. Напрыклад, для беларускіх гаворак характэрна мяккаэрасць. Ва ўсіх гаворках прысутнічаюць дзеканне, цэканне, апрача поўдня Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Тут ужываюцца мяккія зычныя [д] і [т]. У гаворках Віцебскай вобласці ўжываецца цоканне. У беларускай мове няма яснага вымаўлення цвёрдага [г], а ёсць фрыкатыўнае, у адпаведнасці з якім [г] вымаўляецца з прыдыханнем.

У спевака народных песень павінен быць добра наладжаны механізм правільнага вымаўлення слоў. Валоданне мясцовым дыялектам неабходна для “ўжывання” ў тэкст народнай песні. Навучанне размоўнасці ў народных спевах прадугледжвае правільнае фарміраванне галосных і зычных літаратурнай беларускай мовы. Менавіта аўтарскія творы і апрацоўкі народных песень па-трабуюць захавання прыгожага песеннага тону, зразумелага данясення тэксту і адпаведнай вакальнай тэхнікі. Для захавання рэгіянальнай манеры спеваў неапрацаванай беларускай народнай песні спеваку неабходна ўмець перадаць асноўныя рысы мясцовай гаворкі, захаваць выканальніцкую манеру, дзе спалучаюцца не толькі класічныя прыёмы гукаўтварэння, але і спецыфічнае фарміраванне гуку на падставе фальклорнай традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перавага таго ці іншага галоснага, напрыклад [о] ў окаючых ці [э] ў экаючых гаворках, дазваляе абапірацца на дыялектную аснову тэксту песні і ў спевах падпарадкоўвацца гучанню гуку, што пераважае. Тэмбравае гучанне голасу пры гэтым выраўноўваецца за кошт прыстасавання да пэўнага галоснага, што дапамагае захаваць выканальніцкую спеўную традыцыю.

---

*1. Стулова Г.П.* Теория и практика вокальной работы в хоре: Учеб. пособие. — М.: Изд-во Моск.гос.пед.ин-та, 1983. — С.22.

*2. Шамина Л.В.* Об искусстве народного пения //Фольклор и фольклоризм. Традиционный фольклор и современные народные хоры и ансамбли: Сб. науч. тр. — Л.: Ленингр. гос. ин-т театра, музыки и кинематографии, 1989. — Вып. 2. — С. 25.

*3. Крывіцкі А.А.* Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі. — Мн.: Т-ва па распаўсюдж. паліт. і навук. ведаў БССР, 1961. — 40 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ